Цана асобнага нумэру 5 кап. (10 грошэй).

№ 3. Вильня, 20 сенцябра 1906 г.

Год I.

Наша Доля

першая белоруская газэта для вёсковаго и местоваго рабочаго народу.

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литэрами.

Адрэс рэдакции и администрации: *Вильня, Виленская вулица 32.*

Цана: з перасылкаю и дастаукаю да хаты: на 1 год—**3 руб.**, на 6 месяцоу—**1 руб. 50 кап.**, на 3 мес.—**75 кап.**, на 1 мес.—**25 кап.** Без дастауки и перасылки: на 1 год — **2 р. 40 к.**, на 6 мес.—**1 р. 20 к.**, на 3 мэс.—**60 кап.**, на 1 мес. — **20 кап.** За границою: на 1 год—**4 руб.**, на 6 мес.—**2 р.**, на 3 мес.—**1 руб.** Перамена адрэсу—**20 кап.**

АБЪЯУЛЕННЯ прыймаюцця на наследняй страницы па **20 кап.** за линейку пэтиту.

Рукаписы и карэспандэнции, присыланыя у Рэдакцию, мусяць быць чытэльна написаны з фамилею и адрэсом таго, хто яе присылае. Адрэс тольки для ведама Рэдакции.

Ад Рэдакции.

Уселякие грошы присыланые у Рэдакцию „Нашае Доли", просим прысылаць канешне на имя Ефстафия Сымоновича.

Старое лекарство.

Правицельство нашэ на усе хваробы мае адно тольки лекарство. Лекарство гэта—цыркуляр. Захварэу народ на свабоду, правицельство—тыц цыркуляр, захварэу народ на жаданне зямли—тыц други цыркуляр; захварэла жменя людзей на обиранне манаполек, почт—зноу цыркуляр. Стольки ужо гэтаго лекарства прыняу народ, а памагло яно бядзе так як нябошчыку кадзидла. Здаецца доси былоб гэтых цыркуляроу, здаецца час было бы зразумець, што каб вылячыць народ з яго нядоли адных цыркуляроу мала.

А правицельство чы ня ведае, чы ня хочэ ведаць аб гэтым.

Новая хвароба завелася: мужыки ня плацяць падаткоу. И вось правицельство и на гэту хваробу прыписывае сваё старое лекарство—цыркуляр. У цыркуляры гэтым министр скарбу Коковцэв и председацель министроу Сталыпин прыказываюць губэрнаторам, каб яны усими, хацябы найстражэйшыми законными способами пастаралися прымусиць мужыкоу плациць падатки. Цяжкая на долю губэрнаторoу выпала работа: Як возмеш што небудзь у таго, у каго нима ничога? Як збирать падатки, кали мужык так згалеу, што не то на падатки, на хлеб грошэй ня мае? Што дзень газэты прыносяць усё новые весьци з усих канцоу Расеи аб цяжкай мужыцкой нядоли.

Тутака апошни хлеб даедаюць, там ужо мруць з голаду; тутака разгнездзиуся галодны тыфус, там—иншая якая зараза з голаду сотни людзей гониць на той свет, дзе нима ни мук, ни нядоли. Што возьмеш з гэтых людзей? А у тых месцох, гдзе Бог дау ураджай крыху лепшы, ци многа возьмеш ад мужыка? Ци многа возьмеш ад удоу и сирот, кармицели каторых не вернулися з Далёкаго Востоку, або згинули ад куль сваих братоу? Ци многа падаткоу збярэш з вёсак, праз каторые праехали карацельные атрады,

у каторых гудзеу гром пушэк и з дымом шли мужыцкие хаты?

Ци многа возьмешь ад людзей, у каторых апроч жыцця не засталося ничога?

Не, ад тых людзей не возьмеш ничога. Тутака и усе законные способы не памогуць. Паслухайце, што пишэць газэта „Страна“: у Ставропольским павеци голад, податкоу плациць нима чым. Мужыки змауляюцца аб тым, як бы усим разом атказацца плациць падатки. „Калиж будуць вымагаць падатки праз палицию и стражникоу, тады пойдзем усе у вастрог на гатовы хлеб“, так кажуць мужыки у сваей нядоли. И ня дзива, бо усёж лепшы вастрог, як смерць з голаду. Падыходзиць зима, з ёй разом да мужыцкой хаты прыдзе новы госць—холад. За им яго сястрыца-смерць з вострою касою. Ци ад яе правицельство так сама лячыць будзе цыркулярами? Годзи! час зразумець, што цыркуляр утрациу силу, што ад нядоли вылячыць могуць тольки народные выборные и правицельство, паслушное им!

Суд.

Эх, братцы, кепска стала жыць на свеци, кали ужо за курыцу сусед суседу анэгдайсь калом галаву пашчапау ды патом за гэту самую курыцу (вядома, спусциушы адзин другому юху) будуць цягацца па следавацелёх, ды па судох! А што за шкоду зрабила курыца? От, выдзерла на градзе бурачкоу на пядзи тры! А им, гэтым задзиракам, кольки гэта курыца будзе каштаваць? Цэлага падцёлка, кали ня больш! Нима цяпэр меж маладых дабра!...

А от паслухайце вы, якие у нас дауней были суды. Нябошчык Янка (вечны пакой яго душы), „махляром“ што звали, забрау са сваяго ауса двух быкоу Рыгора Канцавога; прауда, ауса зъесць—мала зъели, але шмат стратавали; дома пагадзицца—не пагадзилися, написау пахтар прашэнне и пашло на суд.

Цешыуся и я з гэтаго, бо ужо кольки часу, як и на маих шнурох пасля ночы атава была стратована: не иначэй як гэта работа Рыгоравых Лысага и Падласага! Але не злавиушы за руку, не кажы, што злодзей. Шмат было гутарки аб гэтых быкох у вёсцы, тольки мне Сталючонак падшапнуу, што як у ночы хадзиу на рунь пильнаваць зайца, бачыу на маей атави кабылу удавы Габрэлихи. Эгэ, думаю сабэ, недачэканне злаулю и я!

Павячэраушы, зараз абуу лапци, насунуу кажух, ды цихонька шусць праз сенцы на гумнишчэ, гоцнуу праз плот, ды борздзенька на мяжу и бух!... Ляжу... чакаю...

Тольки першые пятухи запели, як чую, едзе нехта на маю атауку... Муси и аднаго пацера не паспеу бы чалавек згаварыць, ходзе ужо Габрэлихи кабылка па маей атави и хрумшчыць, аж пена идзе, а за уздэчку трымае ды водзе сама Габрэлиха. Здуру пагарачыуся я, и не пачекаушы каб ближэй мяжы падышли яны,—крыкнуу, скакнуу да кабылы; але и Габрэлиха, каб яе паралюш, прытная была кабецина, як вишь на кабылу, ды у скочку — науцеки!... Гнауся я, гнауся, але паночы—куды там!... На заутра, чуць свет. узяу я старасту, двух панятых и следом як раз давяли; прызналася и Габрэлиха але заплациць за шкоду не хацела; падау и я на суд.

Праз яких две нядзельки прыходзяць нам павестки: и Рыгору з Янкою, и мне з Габрэлихою—усим на адзин дзень. Паехали. Миравы судзья быу у нашым участку немец и надта цяжка было з ним разгаварыцца: мала нашэй гутарки ён разумеу, а мы яго—ешчэ меньш.

Выкликае на сам перэд Янку и Рыгора. Пытае:

— Ну, как биль?

— Не, кажуць, Вашэ Скародзе, Дали Бог, мы ня билися...

— Больван, закрычала судзья, я спрашиваю, какой патрава?

— Не, кажэ Янка, не па траве, а па аусе, Вашэ Скародзе, хадзили Рыгоравы быки...

— Какой бик?

— Лысы и Падласы, Вашэ Скародзе...

— Больван, мошэнник, закрычала ешчэ горш судзья, у прашэнии кафарить воль, а теперь—бик, сам не снаешь, кто имел потрава! Идите дамой, дамой! мне время нет! Дзело кончэно!

Вышли Рыгор з Янкам, а я стаю и дрыжу: не иначэй, як пахтар напутау у прашению и замест быкоу написау валоу! Ах каб яго лиха! А кали и у маим прашению зманиу ды замест кабылы—написау каня?!... Стаю... дрыжу... и языка у губе забыуся... Стаю—шапчу (каб ня збицца с панталыку): кабыла, кабыла, кабы... А тут, як раз кличаць мяне з Габрэлихай. Вышоу... стаю.. дрыжаць калены (першы раз на суд папау!)... Бачу—и Габрэлиха, як хуста збялеушы

стаиць... Кабыла, кабыла, кабы... шапчу я цёнгем, аж тут трах! Миравая и пытае:

— Ну, как?

— Кабыла, Ваше скародзе, кажу.

— Как кабыла? кто?

— Габрэлиха, Вашэ скародзе; але ужо ни вочы маи ни бачуць, ни вушы ня чуюць... Стаю... дрыжу... як праз туман бачу: судзья смяецца и зноу пытае:

— Кто кабыла? кто?

— Удава—Габрэлиха, Вашэ скародзе! Але у вачах неяк весялей мне робицца; мусиць дзела выиграю, бо бачу: судзья, замест гневу, смяецца, ды изноу да нас:

— Ну, от и хорошо: ты, кажэ, хоць и мужчына, а маленьки, а она хоть и баба, но правда, большая кобыла, так вы лучше так... бэз суда... зачэм суд? помертесь!

Глянуу я на Габрэлиху, зиркнула яна на мяне, стаим, чакаем, што будзе...

Но, идзице, кажэ, у калидор—памертесь! На то суседзи—зачэм суд?

Вышли мы у калидор... глянуу я на Габрэлиху, кепска, думаю, будзе: хоць вина яе, але як прыдзецца да меры—не дам рады: баба рослая! Стали мы гэта бокам, узняуся я на цыпачки и так на корх не хватае, а Габрэлиха, каб ей дна ня было, дагледзила гэту штуку и кажэ: не, суседзе, гэта ня мера; кали судзья сказала памерыцца,—то трэба памерыцца як мае быць; судзья лепш ведае, што и як трэба да дзела; давай плячми станем. Як стали плячми, а баба ешчэ учапилася за маю бравэрку, ды цисне у низ, каб на цыпачки не узняуся,—дык куды там! Амаль не на усю галаву нижэй я росту! Уздахнуу я, але штож зробиш: воля Божа! Вярнулися у камэру, а тут зараз судзья и пытае:

— Ну, как?

— Памерылися, кажэм, Вашэ скародзе!

— От и хорошо! Идите, кажэ, с Богом домой, дзело кончэно; я очэнь рад!

Вышли мы. Тольки..... але што там валаводзиць? хочаце ведаць яки канец? Думаеце, што як цяпер вы, маладые, зараз у зъезд, у палату, у Пицярбурх? Ани думаць! Да Бэрки трапили и Рыгор з Янкам, и я с Габрэлихай! Што и як там было?... ат, было, бо было, але с таго часу ня ездзили на суд!....

Ядвигин Ш.

Як мужыку палепшыць сваё жыццё.

(прадоужэнне).

Перш наперш у саюзы павинны злучацца дворные парабки и уся дворная чэлядзь: жывуць яны усе разам, як адна сямья, працуюць на аднаго пана,—роуна у их работа и заплата за яе, роуно здзирство панское. Им лягчэй як усим иншым вёсковым работникам зразумець, скуль выйшла беда их, лягчэй згаварыцца, чаго дамагацца ад паноу и яким способом. Зямли у их найчасцей саусим нима, и тольки работа у двары дае им можносць жыцця. Дзеля таго и палепшэння сваго жыцця могуць яны чэкаць тольки тады, як дабьюцца лепшых варункоу працы, каротшаго рабочаго дня, большае платы.

Каб гэта зрабиць, трэба усим разам исци и моцна злучыцца у свой саюз. Усим добра ведамо, што як кожны парабок пачне асабно дабивацца чаго-небудзь, то ня тольки ничога не дабьецца, але и дрэнна яму будзе, бо пан яго вон са службы прагониць. Калиж усе дворные работники заступяцца за сваго таварыша, то з ими пан ничога ня зробиць!

Як у кожным двары зробицца гэтаки саюз дворных работникоу, то трэба, каб усе суседние двары ведали адзин аб другим, каб разам згаварывалися як лепей ваевать за сваю долю и таким парадком злучалися у вялики и моцны саюз вёсковай працавитай беднаты. Гэта будзе вялikая сила у вайне з багачами за шчасце усяго працуючаго народу!

Але у вёсцы жыць цяжка не адным тольки парабкам, ня тольки тым, хто саусим ня мае зямли, але и усим малоземельным мужыкам, чыншэвикам, арэндаторам и другим. И яны усе, кали хочуць дабыць сабе лепшое жыццё, павинны так сама злучацца у саюзы, як и парабки у двapox. Усе, каму цяжка жыць, павинны меж сабой згаварыцца найперш у сваёй вёсцы, а пасля са сваими таварышами нядоли ва усих вёсках сваей воласци чы парафии. Так зробяцца саюзы волостные або парафиальные, и яны ужо патрапяць абараняць свае супольные справы, патрапяць заступицца за сваих таварышоу, кали на тое будзе патрэба.

У сёлетним году у нашым краю было шмат забастовок па вёсках; гэтыми забастоуками думали дабицца ад паноу большэй платы за работы у поли. Але аказалося што и забастоуки ничога не памогуць мужыком, кали ня будзе у их добрай згоды, кали ня будзе таких саюзоу, як мы тутака написали.

Бывало так: адна вёска пастанауляе не працаваць за малую плату и дамагаецца большэй. Тым часам другая вёска спусциць крыху цану, прыходзяць да двора чужые мужыки працаваць за меншую плату, а тые, што хацели забастоукаю дабицца большэй платы, застаюцца саусим без заработкоу.

Бывала и гэтак, што шмат суседних вёсак згаварывалися патрэбоваць ад памешчыкоу большэй платы. А паны, замеж таго, каб плациць им, скольки яны прасили, сваими дворными парабками пры помочы машын пазбирали ураджай без падзёных работникоу. И тут мужыки ничога не выиграли. А чаму?

Таму, што не было у их саюзоу, што ня шли разам усе мужыки. Так было у сёлетних забастоуках, так бывае и у иншых справах. Пара ужо зразумець мужыкам, што тольки братнею згодою, тольки саюзом усих вёсак и двароу вёсковая працавитая беднота зможэ скинуць здзирства багачоу, зможэ бараниць сябе ад уселяких крыуд, здзеку ды гнибення.

И усе павинны ведаць, што рабиць гэтакие саюзы нима што баяцца: гэта так сама профэссиональные саюзы, як ёсць па гарадох саюзы краўцоу, шэуцоу, сталяроу, друкароу, слесароу и иншых работникоу. Усе яны маюць адну цэль—палепшыць сваё цяжкое жыццё, и за гэта нихто их караць ня мае ниякого права. Яны маюць свае уставы, и гетые уставы утверджае само правицельство.

Вяликая и святая справа—гэтые мужыцкие саюзы, и прыступаючы да устройства их трэба добра падумаць, як их рабиць.

Аб усих справах аднаго двара чы адной вёски павинны пастанауляць сабраушыся разам усе тые таварышы, што належаць да саюзу у тым двары або вёсцы. Але як трэба пастанавиць аб таких справах, каторые належаць да усей воласци або парафии, тады павинны сабрацца таварышы з усих дварных и вёсковых саюзоу. Ведама, што рабиць гэтакие вяликие сабрання ня лёгкая рэч, а и палиция па вёсках часта суне свой нос туды, дзе ня мае на тое ни права ни патрэбы. Ды и мужыком на гэта не заусяды часу стане, и надта далёка исци прыходзицца. Але на усё гэта ёсць рада.

Дворные и вёсковые саюзы павинны ад кожнаго двара и ад кожнай вёски выбраць таких людзей, каторым усе таварышы верaць, и гэтые выборные людзи з усей воласци чы парафии павинны збирацца усе разам у адным месцы и тутака ад имяни выбраушых их таварышоу радзиць и пастанауляць аб агульных справах. Гэта будзе *валасная рада або прауленне саюзу.* Усё, што пастановиць гэта рада, павинны свята спауняць усе таварышы з дворных и вёсковых саюзоу сваей воласци; иначэй увесь заюз ня будзе мець силы.

Але канечне, павинны быць и гэтакие людзи, каторые глядзели бы за тым, чы нима якой важной справы, аб каторой мусиць пастанавиць валасная рада, сазывали бы гэту раду, кали трэба, и даглядали, каб спауннялися усе пастанауления яе. Таких людзей выбирае *сама рада*, и яны тады называюцца *валасным комитэтом.*

Вот, кали усе вёсковые работники зробяць гэтакие саюзы, тады яны змогуць дабицца таго, чаго ужо добилися работники па гарадох ды мужыки у других краёх, перэстануць галадаць, пачнуць жыць лепшаю, шчаслиушаю долей.

* * *

Мы на пачатку ужо казали, што цяпер на свеци таки парадак, пры каторым заусяды будуць и багачы, и бедные; адны людзи будуць жыць з цяжкай працы других, сами ничога ня робячы. Алэ гэты парадок—ня вечны: зрабиу яго ня Бог, а людзи, и людзи сами пераменяць у ём усё злое. Тольки трэба ведаць, што зрабиць гэту перамену зможэ тольки увесь рабочы народ, *уся вёсковая и местовая працавитая беднота,* кали усе разам пойдуць па адной дарози. Дзеля таго усе мужыцкие саюзы *павинны злучацца праз сваи камитэты з рабочыми саюзами и партиями у горадзи.*

Нехай тольки усе вёсковые работники, усе мужыки зразумеюць и добра помняць, што *яны сами могуць палепшыць сваё жыццё,* нехай сами пастараюцца аб сваих саюзах, и тады яны дабьюцца усяго, што патрэбна для усей працавитай беднаты.

Усяго па троху.

Писулька да рэдакции.

Шаноуна Рэдакция!

Прачытаушы у № 2 „Нашой Доли“ артыкул пад тытулам „Пагром“, хачу слоу кольки сказаць ад сябе и дзеля таго прашу выдрукаваць тое, што Вам прысылаю:

Ешчэ аб тым самым.

Хто з нас, браты, ня чуу аб зладзействи и цэлых рэках крыви нявинной, слёз жон, удоу и сирот, вылитых у Седльцах?—Пагром! на адну мысль аб гэтым сэрцэ дрыжыць, цело стыне. Браты, кажыце и вразумляйце адзин другому, каб на нас ни за якие грошы, ни за якие скарбы ня брызнула братняя кроу нявинная, будзь то жыдоуская, русская, польская, наша чы иншая, японская чы китайская, баранице каждаго и ня верце, хто Вам кажэ, што хто иной веры, той непрыяцель. Усе працавитые людзи—то вашы таварышы и прыяцели, и у громадзе сила; чым народ болей мае взаемных интерэсоу и бед, тым ён сильней павинен быць звязаны с сабою, тым ён скарэй палепшыць своё жыццё.

Вашы праудзивые прыяцели тые, што працуюць на рали ды у фабрыцэ, што ядуць хлеб, бульбу и жывуць у бедной хаци, а не у палацах и дварцох, ничого ня робячы, пьюць вино заморское, ядуць птушки и рыбы заграничные.

Есць на свеци злые людзи, падобные да дзиких шалёных звероу, яны называюцца „хулиганы“ и маюць свае кумпани, прозваные „чорносеценными“; яны устраиваюць пагромы и бьюць невинных людзей, купаюцца у их крыви. Стольки ужо крыви яны пралили, што бы дауно у ёй сами патапилися.

Вон ганице тых людзей, так каб им ахота атпала наусягды!

Ведайце, што пляма такая на век застаецца, и хто руки у крыви нявинной запэцкае, той ад ёй не адмыецца, на што маем шмат прыкладоу.

Чыжук Ошмянски.

З Беларуси и Литвы.

Вильня. У нас трываюць обыски и арэшты. Без мала не праходзиць дня, каб палиция не перэтрасла адну—две хаты, не арыштавала кольки людзей. Вось у панедзелок палиция зрабила обыск у рэдакции газэты „Эхо“, забрала усе писульки и арыштавала 5 людзей. Пасля прышла палиция да книгарни Шлапэлиса, што прадае книжки литоуские и беларуские, и у яго забрала неякие писулки и книжку беларускую „Хрэст на свабоду“. Так само, як людзей, палиция арыштуе и газэты. Польской газэци „Эхо“, катопая маець цэль бараниць справы работникоу, дык просто жыцця нима. Абы тольки газэта паявилася на свет Божы, дык зараз прыходзиць палиция и забирае. Добра тольки, што людзи так хутка раскупляюць гэту газэту, што праз адзин дзень трохи не усё распрадаюць.

Такаяж доля и литоуской газэты „Naujoji Gadynė“.

Работники, хаця правицельство их цисьне и арыштуе их газэты, як кольвечы таки сабе даюць раду. Яны добра зразумели, што у грамадзи—сила, и дзеля таго злучаюцца у саюзы. Нядауно пачалася бастоука сталяроу. Яны трэбуюць большэй платы и каротшаго рабочаго дня.

Выборы у Государственую Думу у Виленск. губ.

Хаця выборы у Государственую Думу, можно сказаць, ешчэ за гарами, а памешчыки у Виленской губэрни ужо пачали прыгатауляцца да их. Сцеражонаго и Бог сцеражэ—кажуць памешчыки; пакуль там што будзе, а яны ужо павыбирали выборные комитэты немаль в усих паветах апроч ашмянскаго и лидзкаго. 4-го акцябра у Вильни маюць зъехацца усе члены выбранаго праз памешчыкоу губэрнскаго комитэту. Тутака яны будуць радзицца, яким способом пакеравацъ выборами так, каб были выбраны их (памешчыкоу) кандыдаты. Ня дрэнна былоб, каб и мужыки падумали аб выборах.

З Минскаго повету. У маёнтку Пятроушчыни, каторую трымае у арэндзи Паулюць, было такое здарэнне. Прышоу неки бурлак и кажэ: „Вот я чэлавек благонадёжны“—и пры гэтым паказау па перку, у каторай было написано, што ён запрауду благонадёжны—„Я ведаю, што ваш маёнтак хочуць спалиць; кали вы мне дасцё 25 рублёу, то я гэтак зраблю, каб яго не спалили“.—На гэта яму Паулюць адказау, што ён дружыць з сваими суседами-мужыками и ничога не баицца, а радзиць исци „благонадёжнаму падарожнаму“ сваей дарогаю. Праз кольки дзён пасля гэтаго маёнтак Паулюця пусцили з дымом. Дагадауся тады Паулюць, хто палиць двары. „Благонадёжны падарожны“ больш не паказауся.

Слоним.

У паветах часта цяпер бываюць сабрання багатых памешчыкоу.

На гэтых сабраннях памешчыки талкуюць аб выборах у гасударственую думу.

Агульны зъезд памешчыкоу мае быць у горадзи Вильни.

З Польшчы.

Ваенное палаженне, каторае и па дзись дзень висиць над усею Польшчэю, не патрапила таки уцишыць рэволюцыйнага розруху па городох Польшчы. Як дауней так и цяперока, што дзень гозэты прыносяць весьци аб мордаванню и разбояк аб обысках и арыштах. Ваенно-полевые суды и разстрэлы не памагаюць ничога.

У Варшави народ неяк зжыуся з военным палажэннем. Обыски на вулицох и вечные арышты ужо не пужаюць никога. Варшавяки якбы жартуюць з усяго гэтаго. Часам тольки, кали праграмиць па вулицох, гром салдацких выстрэлоу народ у трывози кидаецца ва усе стороны, як хусты бялеуць твары людзей. Але усё гэта скоро праходзиць, на вулицох зноу закипае жыццё, зноу чутны смех и гомон вясэлых варшавякоу. Найбольш таки ад ваеннаго палажэння церпяць работники. Яны, што на сваих крэпких плячох вынясли усю цяжэсць доугих бастовок, цяпер, хоця церпяць голод, таки не трацяць надзеи у близки канец сваго цяжкаго жыцця. Злучэные у крэпкіе союзы, работники Польшчы ня гледзючы на военное палажэнне и на ваенно-полевые суды, усё таки маюць вялiкую силу, з каторою мусиць считацца правицелство.

Па Расеи.

Па вёсках.

Ад вёсак идуць пужливые весьци: мужыки рухаюцца!

З Казлоускаго павету, Воронежской губэрнии пишуць, што цяпер мужыки сваим розумом разтауковываюць и разъясняюць найтруднейшые справы палитычные. Але найбольш их цикавиць гэта тое: яким способам прымусиць памешчыкоу и правицельства, каб аддали зямлю працуючэму народу. На валасных сходах мужыки пастанауляюць не браць зямли ад памешчыкоу, не служыць за парабкоу, кали памешчыки ня будуць плациць па устаноуленой цане. Падаткоу так сама пастанавили не плациць. А кали правицельства назначыць лицытацию скацины, то нихто з мужыкоу не мае права прыйсци и купиць. Да думы адна часць мужыкоу ня хочэ выбираць дэпутатау, кажучы: „ня стоиць“, бо усё роуно их разгоняць як яны захочуць зямли. А другие канешне хочуць пасланць сваих дэпутатау, але таких, каторые не адступяць ни перэд якою лихою силою.

Сходы збираюцца пры стражниках, але палиция не чэпае мужыкоу.

Ешчэ летось мужыки пастанавили прагнаць з сваго обчэства тых, каторые служаць у палиции.

После таго прыгавору часць стражникоу зразу кинула службу, а часць подала прашэння аб увальненни. Спрауник спалохауся, што астанецца бэз памочникоу и паслау тэлеграму да губэрнатора пытаючысь: „Што рабиць?“ Губэрнатор прыказау аддаваць пад суд тых стражникоу, каторы бэз прычыны кидаюць службу. Бедные стражники асталися; але такая там их служба: як з камменя вада.

(Страна).

Напасць чужынцоу.

Да Житомирскаго павету прыехали на днях кубанские казаки. Ходзяць весьци, што казакоу прыслали на помоч палиции и што яны будуць размешчэны на кватэры пры станах. Мужыки вельми зацикаулены и задзиулены новым невиданным войском. А некаторые дык ня вельми верaць, што присланные войска належаць да Расейскаго царства.

Прымерам можэ служыць ось якая гутарка: У пиунай крамцы сядзело кольки казакоу кубанских; вот уходзиць мужычок и убачыушы казакоу, проста палец палажыу на губах з дзива. „А што прыглядаешся?“ спытау адзин казак, падбегаючы да мужыка. „А гляжу, бо як живы, то ешчэ не бачыу такога войска. З якога вы царства и чые вы подданые.?“ пытау мужык. „Мы русские подданые, мы дабро робим для сваго гасударства. Мы успакаиваем народ“. Мужычок паглядзеу, пабледнеу, плюнуу и пашоу бурчачы. „Якоеж гэта яны нам маюць дабро зрабиць?“.

Гутарки аб гаспадарцы!

(Прадаужэнне).

Усякое збожэ, як и чэлавек и усё жывое, каб расци и радзиць, павинно пиць и есци; ня будзе таго—згине з голаду чэлавек и скацина, згине и расценне. Разница тольки тая, што чэлавек и скацина ротом ядуць, а расценне сваими корнями. Як жэ гэта робицца?

А вось як. Перш наперш патрэбна расценню вада, бо яна распушчае па крышэчцы зямлю, распущае яе так само, як соль або цукер, тольки што соли чы цукру шмат у шклянцы вады распусцишь, а зямли стольки, што и вокамъ не убачыш. Праверыць гэта ня трудна. Вот вазьмице чыстай крыничнай вады, налейце у саган чы у гаршчок яки и гатуйце яе, пакуль уся яна ня выкипиць. Пасля зноу у гэты самы гаршчок ня мыушы яго налейце вады, зноу выгатуйце яе и так зрабице тры чы чатыры разы. Тады на сценках гэтаго гаршчка абачыце накип. Вось гэта накип и ёсць тое, што вада з зямли распусцила; вада паром уляцела, а у гаршчку засталася земля, катора у ёй была распущена. А ещэ лепей абачыць гэта можна у нямытым самавары чы у катлох; там заусяды праз яки месяц—други накип такая збираецца, што пасля добрая гаспадыня, каб самавару не папсаваць, адбиваць яе мусиць.

Як кинеш зярно у зямлю, а земля як трэба мокрая, то яно пачне там пучнець и выпушчае перш наперш маленьки расток, каторы и цягне з зямли воду, а разам з вадою и крыху зямли у ёй распущэной и усё, што расценню патрэбна, што натура для яго прыспасобила. Гэты расток выцягиваецца усё глыбей и глыбей у зямлю, а як ужо акрэпне и падрасце, тады пачынае сам сабе яду шукаць—знойдзе у грудцы зямли таки каменчык, што цэолитом завецца, абниме грудку сваими валасками и трымае так моцна, што як пачнеш выцягаць з зямли маладое расценне, так напэуна выцягнеш яе з гэтаю грудкаю. Ось у гэтай грудцы зямли и ёсць патрэбные расценню каменчыки, тольки их не абачыш простым вокам, бо яны надта дробненькие. А з растка и карэннёу выступае таки квас, што у ём каменчык распушчаецца, и расценне гэта пье и цягне, пакуль ня выцягне таго, што яму карыстна. А тым часам вырастаюць другие карэнчыки и робяць тую самую работу, катору рабиу першы расток, так сама як и ён шукаюць сабе яду. Расценне мацуецца, вырастае, выпушчае листы. Як тольки зазеленели листы, и яны идуць на надмогу карэнням, тольки што для их ёсць другая работа: яны з паветра (воздуху) сабираюць усё, што патрэбна для их жыцця, и выпушчаюць вон усё для жыцця нягодное и непатрэбное. Кали знайдзе расценне у молодосци добрую яду, то и добра вырасце и дасць багатое жниво. Ня знойдзе яды—згине або вырасце слабое и без умалоту.

И пачали вучоные людзи думаць: якую гэта яду расценне цягне з зямли, и чы ня можна часам чаго падсыпаць у зямлю, як каню аброк, чы ня можна падкармиць расценне, як скацинку. И даведалися людзи, што расценне з зямли найбольш бярэ фосфор, азот, „кали“; усяго гэтаго кожнаму расценню патрэбна асобная мера: нехай пападзецца расценню такая земля, у каторай будзе шмат азоту, а нима „кали“ и фосфору, так расценне на ёй ня вырасце; або нехай будзе такая зямля, катора мае тольки „кали“ або тольки фосфор, а других ня мае сăусим, то и тут ничога ня узыйдзе. И кольки бы чэлавек ни працавау—усё роуна ничога з яго працы ня будзе.

(Далей будзе у № 4 Н. Д.).

Антось Асина.

Бэларусам.

Встаньце, хлопцы, встаньце, братки!
Встань ты, наша старана!
Ужо глядзиць к нам на палатки
Жыцця новаго вясна.

Чыж мы, хлопцы, рук ня маем?
Чыж нам силы Бог ня дау?
Чы над родным нашым краем
Луч слабоды не блишчау?

Выдзем разам да работы,
Дружна станем, як сцяна,
И прачнецца ад дрэмоты
З вами наша старана!

Якуб Колас.

Ад Рэдакціи.

Першы нумэр «Нашае Доли» па прыказу Виленскаго губэрнатора палиция конфискавала. Разышлася тольки палавина — пяць тысячоу, а пяць тысячоу палиция забрала, так што ничого схавадь не удалося, и дзеля таго высылаць першы нумэр никому ня можем.

Просим у сих нашых чытацелёу писаць да нас, писаць аб усём, што дзеецца аб крыудах сваих и радосьцях, хто як умее. Кали патрэбна будзе каму якая парада—пытайцеся—адкажэмо. Ведайце добра, што «Наша Доля»—газета вёсковых людзёу.

Прысылаючы грошы просим писаць, якое выданне «Нашае Доли» присылаць: чы друкаваное рускими литэрами, чы польскими.

Адресоваць грошы трэба канешне так: Вильня, Рэдакция «Нашае Доли», Ефстафію Сымоновичу. Хто хочэ палучаць газэту, нехай паспишае з прысылкаю грошэй.

Рэдактор-выдауца **Иван Тукеркес.**

Типографія **«Артель Печатнаго Дѣла»**, Вильна, уг. Большой и Рудницкой ул., д. Залкинда.